Чаму Маці Божая аб’яўляецца ў цудадзейных абразах?

Аўтар: С. Вераніка Блізнюк FMA
16.07.2017 00:00



Напэўна, на зямлі няма месца, дзе б Найсвяцейшая Панна не пакінула след. Аднымі з такіх праяўленняў з’яўляюцца цудадзейныя абразы, праз якія Марыя працягвае чалавеку руку і прапануе сваю дапамогу. Ёсць такія і ў нашай дыяцэзіі. Адзін з іх знаходзіцца ў в. Тракелі (Радунскі дэканат). Паводле легенды, гэтую выяву з высакароднай постаццю Багародзіцы з Дзіцяткам на руках у Беларусь прывезлі з Вільні ў 1595 годзе. Абраз двойчы заставаўся некрануты агнём падчас пажараў у касцёле. Пасля гэтых містычных падзей у народзе пачалі распаўсюджвацца сведчанні аб ласках, што Марыя даруе ў сваёй тракельскай выяве: невідушчы чалавек дакрануўся да абраза Маці Божай і стаў бачыць, дзяўчынка памалілася перад выявай Найсвяцейшай Панны і ацалілася ад паралічу ног. Па сёння ў санктуарыі ў Тракелях адбываюцца шматлікія цуды: аздараўленні ад раку крыві, бясплоддзя, рознага роду залежнасцей.

Людзі вераць і на ўласныя вочы пераконваюцца ў гаючай сіле малітвы да Марыі, якая сапраўды шмат чыніць для чалавека, дадае адвагі кожнаму, хто да Яе прыходзіць. Маці Божая моцна прагне, каб, нягледзячы на цяжкасці, вернікі крочылі да Неба. Няхай пацвярджэннем гэтай праўды будзе апавяданне Бруна Фэрэра “Па прыкладзе Марыі”. †

Аўтар: С. Вераніка Блізнюк FMA
16.07.2017 00:00

Аднойчы ноччу мне прысніўся незвычайны сон. Я ўбачыў доўгі шлях, які цягнуўся з зямлі ўверх і, накіроўваючыся да неба, знікаў у аблоках. Але гэта быў не просты шлях – поўны перашкод, усыпаны іржавымі цвікамі, каменнем, вострымі і рэжучымі кавалкамі шкла. Людзі ішлі гэтай дарогай басанож. Цвікі ўпіваліся ў цела. У многіх былі акрываўленыя ступні. Кожны крок выклікаў боль. Але нягледзячы на гэта, людзі не здаваліся, бо моцна хацелі трапіць ў Нябёсы.

Потым у сне я ўбачыў Хрыста, які ішоў наперадзе. Ён таксама крочыў басанож. Павольна, але ўпэўнена, ніразу не параніўшы ногі. Езус ішоў і ішоў. Нарэшце Хрыстос дасягнуў неба і сеў там на вялікі залаты трон. Ён глядзеў уніз, назіраючы за тымі, хто падымаўся. Позіркам і жэстамі запрашаў іх да сябе.

Адразу пасля Збаўцы ішла Марыя, Яго Маці. Яна ішла яшчэ хутчэй, чым Езус, бо ставіла свае ступні на сляды, пакінутыя Сынам. Такім чынам Марыя хутка дайшла да Хрыста, які пасадзіў Яе на вялікім крэсле па правым баку. Найсвяцейшая Панна таксама стала падбадзёрваць тых, хто падымаўся, заклікаючы ўсіх рухацца па слядах, пакінутых Езусам: гэтаксама, як рабіла Яна. Разумныя людзі паслухалі, і таму хутка крочылі ўверх. Іншыя ж часта спыняліся, скардзіліся на раны, а часам і цалкам здаваліся і падалі на абочыне дарогі, пераадоленыя смуткам…

Чакаем Тваіх “чаму”, якія можаш дасылаць на адрас рэдакцыі.

На пытанні заўсёды гатовыя адказаць салезіянкі са Смаргоні.

Заданне:

падумай, якія цяжкасці маеш у жыцці,і прадстаў іх Маці Божай, моляч